Віктар Швед

# Адплываем з Мора



Віктор Швед

Віктар Швед

# Адплываем з Мора

Беласток 2010

## Вяртанне ў небыццё

На маладога лесу фоне,
Ў асенняй палявой пустэчы,
Дрэва знаходзіцца ў агоніі,
Прыняўшы выгляд чалавечы.

На ствале-целе, што ўмірае,
І выглядае сіратліва,
Нібыта галава людская
З валос развеянаю грывай.

Здаецца, рукі – дзве галіны
Ў адным цягнуцца кірунку,
Як быццам бы яны няспынна
Просяць кагосьці паратунку.

## Кругаварот

Зямля забрала нам бацькоў,
Бацькамі сталіся мы самі.
І састарэліся ізноў,
І хутка пойдзем за бацькамі.

Такі жыцця кругаварот
На нашым незвычайным свеце.
Нясе нам змены кожны год,
Становяцца бацькамі дзеці.

Імчыць людская карусель,
Якая ў пастаянным віры.
Яе аднолькава мадэль,
Змяняюцца дык пасажыры.

Маланкава імкнуць гады,
Нясуць світанні і змярканні.
Нас накіроўваюць туды,
Адкуль ужо няма вяртання.

# Дарагая вёска Мора — мая калыска і апора

## Мазалі

Мой бацька царскім быў салдатам
Падчас сусветнай першай.
Уцёк з палону і дахаты
Прыйшоў ледзь не памершы.

Данеслі, быў перыяд зверскі,
Шукалі, быў пад страхам.
Пайшоў да Лаўры ён Пячэрскай,
Дзе дзядзька быў манахам.

З манахамі там энергічна
Ён абрабляў палетак.
Тут захапіў яго Кастрычнік
І вышвырнуў адгэтуль.

Вяртаўся татка мой дахаты,
Ў сваю вёску Мора.
Яго Кастрычніка салдаты
Упільнавалі скора.

Адзін з іх кажа: „Шпион-сука,
Расстреляем прямо!"
А другі: „Смотри на руки,
Шпион и с мозолями?"

Жыццё татульку даравалі,
Вярнуўся ён дадому.
– Мазалі уратавалі, –
Ён паўтараў, вядома.

## Аргенціна

Судзіўся бацька за зямлю няспынна
У міжваенныя змагарныя гады.
І з роспачы з сям'ёй у Аргенціну
Эміграваць збіраўся назаўжды.

Неспадзяваная вайна спыніла
Бясконечны судовы працэс
І задуму нам прадухіліла,
Карчаваць каб аргенцінскі лес.

Вызваліцелі аднесліся варожа
Да змучаных жыццём маіх бацькоў.
Аграбілі зусім сям'ю са збожжа
І далучылі нас да кулакоў.

Ды калі б бацька мой не акульгавіў,
Тады б, вядома, Лейкін-камандзір
Не ў Аргенціну неўзабаве
Нас скіраваў бы, а ў Сібір.

## Табе, татулька, дзякуй!

Стаяў над Бацькавай магілай
І ад дакору ледзь не плакаў,
Што не сказаў: – Татулька мілы,
Табе за гэта шчыра дзякуй,

Што не пакінуў мяне ў вёсцы,
Калі ты быў страшэнна хворы,
Каб працаваў я на палосцы
І пастаянна жыў у Моры.

Што скіраваў мяне вучыцца,
Каб мог я здабываць асвету,
Каб запаветам Тваім збыцца,
Каб мог стаць у жыцці паэтам.

Збыліся Твае, Татка, мары.
Век дажываю чалавечы.
Ды я пражыў яго не дарам
І ўжо таксама стаў старэчам.

## Трэніроўка

Даўнія здарэнні ў хаце
Сталі мне прыпамінацца.
Дрэмле, седзячы, маці
Пасля непасільнай працы.

Маму кранаю ласкава:
Бачу, сон надта морыць.
Упасці можна з лавы,
Скалечыцца, быць потым хворай.

А за сталом сёння зноўку
Я задрамаў так сардэчна.
Дык, відаць, трэніроўку
Распачаў прад сном вечным.

## Пекла і рай

Мой бацька раптам акульгавіў,
Няздольным стаў да цяжкай працы.
Маці пераняла ўсе справы,
Якімі стала занімацца.

Не пагадзілася з нявесткай,
Востраю жонкай майго брата.
І на жыцця свайго ўжо рэшткі
Мусіла выйсці з уласнай хаты.

Пайшла жыць да дачушкі Ніны,
Каб не знайсціся ў паняверцы,
Ужо хварэючы няспынна
На сваё змучанае сэрца.

І перад смерцю вось такое
Сказала мама дарагая:
– Я пекла пражыла зямное,
Могілкі будуць маім раем.

## Мала мама спала

Мама, седзячы, драмала,
Калі дзетак калыхала.
Ёй расплюшчваліся вочы,
Калі плач пачула ўночы.

Мама вельмі мала спала,
Калі дзетак гадавала,
Калі ўлетку на палетак
Пад снапкі насіла дзетак.

Мама і зусім не спала,
Як прыйшла вайны навала.
Ад бяды апошняй сілай
Сям'і долю бараніла.

Працай змучаная мама
На пагосце, пад крыжамі
Спіць спакойна сном трывалым…
У жыцці так мала спала.

## Вера

Бацькі найдаражэйшыя на свеце,
Пашана ім, любоў і наш паклон.
Заўсёды памятаюць аб іх дзеці
Да жыцця свайго апошніх дзён.

А калі адыдзем за бацькамі,
Калі аб нас ужо загіне слых,
Верым, што будзем жыць і мы таксама
У сэрцах блізкіх, тых, яшчэ жывых.

## Конскі сум

Ён працаваў як вол рабочы,
Араў, плён кожны з поля звёз.
Заўсёды сумныя меў вочы,
Бо сумны быў той конскі лёс.

Свой век прагараваў у Моры,
Ніхто яго не зведаў мар.
Тут заўжды родны панадворак,
Яго нязменны гаспадар.

Не дамагаўся ён замнога:
Паесці каб, глытнуць вады,
Ды крышку стайневай бярлогі...
І так цяклі дзянькі, гады.

Вёз неўзабаве ў дамавіне
Гаспадара ў апошні шлях.
Слёзы губляў у каляіне,
Што ў конскіх выспелі вачах.

Ён сутыкнуўся з праўдай горкай:
Эра канчаецца каня.
Трактар стаіць на панадворку,
Як сімвал сённяшняга дня.

## Мой лес

Ажыццявіла мяне маці
У старой драўлянай хаце.
У калысцы з дрэў карэнняў
Рос, як маё пакаленне.

Стравы лыжкаю драўлянай
Смакаваў я пастаянна.
За смаляным сталом сасновым
Я першыя крымзоліў словы.

Са сціплым сшыткам з дрэў паперы
У паэтычны свет паверыў.
Сухія дрэвы ў хлебнай печы
Грэлі ў хаціне мае плечы.

У ложку з габляваных дошак
Я ноччу сніў шмат сноў харошых.
З маткай грыбы я ў лесу ценю
Збіраў у кошык з дрэў карэнняў.

І лес прызначыў свае лішкі
На з вершамі мае ўсе кніжкі.
Я ўжо стары, лес улюбёны
Дасць дамавіну пасля скону.

## Грозная трахома

Не шчасціла мне, хлопчыку малому,
У лазовай старэнькай калысцы.
Нішчыла зрок грозная трахома
І не было з хваробы гэтай выйсця.

Лекара не ведаў люд вясковы,
Жыў ён бедна, з непатольнай скрухай.
І над хворым дзіўныя замовы
Адпраўляла слаўная шаптуха.

І таму чатыры я гадочкі
Сам змагаўся з грознаю хваробай,
Хворыя не дазвалялі вочкі
На двор выйсці з дзедавай трушчобы.

Ды калі я ўпершыню змог глянуць
На цудоўны надта свет наш гэты,
Светам надта быў ачараваны,
Што не мог не стацца я паэтам.

## Дзіцячыя гульні

Будучы падлеткам-хлапчуком,
У прыгожы цёплы дзень вясновы
Басанож я бег за абручом
З дзетварой па вуліцы вясковай.

Або зноў драўляны мы кружок
Гналі бойка вулічнай прасторай.
І заўжды дзяцей мацнейшы бок
Гнаў з кружком слабейшы бок праз Мора.

Тых дзіцячых мілых гульняў шмат
Памяць захавала назаўсёды.
Помняцца яны мне акурат
Выразней з пражытым кожным годам.

## Віця і Міця

Калісьці ў дзедавай хаце
Я, малы жэўжык – Віця,
Надта любіў забаўляцца
З суседзяў сыночкам Міцяй.

Сеўшы на доўгай лаве
Мы пачалі задумвацца,
Што зрабіць, каб цікава
Можна было забаўляцца?

Узляцець каб угору,
Свет убачыць шырокі,
Каб нам з нашага Мора
Паляцець пад аблокі.

Тут жартуе мой тата:
– Свет належыць да смелых,
Трэба вам на пачатак
Абагрэць сваё цела.

Над плітою да болю
Грэлі мы свае ногі.
Не ўдалося адолець
Прыцяжэння зямнога.

## Уралогія

Хадзіў за дапамогаю
Да лекараў няспынна я.
Ляжу на уралогіі
Насычанай урынаю.

І доўгімі сарочкамі
Абдзелены тут хворыя,
Ляжаць яны з мяшочкамі,
Ды ходзяць некаторыя.

Ляжаць мужчыны з ранамі,
З дакучлівай прастатаю,
І тужаць за каханымі,
Ды за сваімі хатамі.

Лёс сумны аб'ядноўвае,
Ляжым і не спрачаемся.
Пасля рамонту, новыя,
Дамоў ізноў вяртаемся.

*14 сакавіка 2001 года*

## Аўтамабільнае крушэнне

Па шыбіне дождж пацёк.
У брата аслабелы зрок.
І раптам магутны ўдар
У вулічны начны ліхтар.
Пагас электрычны стоўп.
Навокал людзей натоўп.
Нашы абалелыя грудзі
Крычаць: – Ратуйце нас, людзі!
Машыну пілуюць умела,
Выцягваюць хворыя целы.
Вялікдзень. Хрыстос уваскрос,
Каб людзей ахоўваць лёс,
Каб жыцця не парвалася ніць,
Каб маглі мы яшчэ пажыць.

*9 красавіка 2007 года*

## Выпадак

Аб начных прагулках марыў
Штодзень перад сном.
На дзіравым тратуары
Ўпаў і трэснуўся ілбом.

І з падбітым хворым вокам,
Страшэнна, на жаль,
Скорая забрала ў шоку
Мяне у шпіталь.

Па выпадку я са тварам
Выглядаў на здзіў,
Нібы ў чорных акулярах
Доўга я хадзіў.

Зразумеў я надта многа:
Пакуль не памрэш
Заўсягды глядзі пад ногі,
Калі недзе йдзеш.

## Памяці швагра Васіля

Швагер мой сардэчны,
Дабрэйшы чалавек.
Мы на зямлі не вечны,
Закончыў Ты свой век.

Меў добрую апеку
Ты у дзяцей сваіх,
Няма на старасць лекаў,
Пакліча смерць усіх.

Жыццёвыя ўсе сілы
Забраў няўмольны час,
Сыходзіш у магілу
І пакідаеш нас.

У роспачы вялікай
Мы молімся да слёз,
Каб Бог душу паклікаў
Па смерці да Нябёс.

Няхай спакойна спіцца
Пасля жыцця трывог,
Няхай Цябе ў зямліцы
Мае ў апецы Бог.

*24 лістапада 2005 года*

## Напярэдадні 2007 года

*Сястры Ніне*

Пасля паніхіды царкоўнай
Па адышоўшым у вечнасць
Швагры маім цудоўным –
З сястрой прывітаўся сардэчна.

Яна не была ў царкоўцы,
Хворая сястрыца Ніна.
Рэдка закінемся слоўцам,
Дажывае ўжо век свой у сына.

Неўзабаве нашай разлукі
Надышла непазбежна хвіліна.
Сястра туліць да шчок мае рукі
І плывуць мне на рукі слязіны.

І сваім затуманеным зрокам
Запыталася ціха, здаецца:
– Зноўку едзеш, мой брацік, далёка,
Ці яшчэ нам прыйдзецца сустрэцца?

## Памяці Сястры Ніны

Сястра мая родная Ніна
Была найвялікшым прызнаннем.
Не ведаў, што ў Элку хвіліны
Нашым былі развітаннем.

Пагаварылі нямнога...
Аб справах блізкіх нам, родных.
Сказала мне, прашу Бога
Да Свят каб дажыць Велікодных.

Пад добрай апекай была Ты
Сям'і дарагога сына.
Аднак будуць сумныя Святы,
Ад нас адыходзіш Ты, Ніна.

Была спрацаваная дужа,
Хвароба забрала ўсе сілы.
Ідзеш у зямельку да Мужа,
Спачыць у супольнай магіле.

Часовыя мы на свеце,
Смяротнікі Святога Духа.
Хай Бог Цябе мае ў апецы,
Зямелька няхай будзе пухам.

*26 красавіка 2008 года*

## Адплываем з Мора

Даражэнькі брат мой, Пецця,
Выбілі хваробы сілы,
Выцерпеўшы на тым свеце
Адыходзіш у магілу.

Пакідаеш жонку, дзетак,
Пажылога свайго брата,
Вёску Мора, свой палетак,
А таксама сваю хату.

Ты сказаў, што Бога моліш,
Каб мець год васьмідзесяты.
Бог Табе дажыць дазволіў
Да тае свяшчэннай даты.

Што зрабіць, жыццё такое,
Мы на свеце толькі госці.
Усе пойдзем за Табою,
Усе спачнем мы на пагосце.

Прыйшла хвіліна развітацца
З Табою, даражэнькі Пеця,
Спі, спі спакойна, мілы Браце,
Няхай Бог мае у апецы.

*16 снежня 2009 года*

## У сваё 85-годдзе

Я нанізаў гадочкаў многа,
Шчаслівых і благіх падзей.
Падлікам пройдзенай дарогі
Становіцца мой юбілей.

Ці многа здзейсніў я, ці мала,
Ці з гонарам пражыў жыццё?
Што астаецца жыць трывала,
А што адыдзе ў небыццё?

Заўжды я са сваім народам,
Мяне трывожыць яго лёс,
Яго ўслаўляю я заўсёды,
Яму свой творчы плён прынёс.

Ад сёння кожны дзянёк новы
Я выкарыстаю, як след,
Каб добрым ўспаміналі словам,
Што жыў не дарам

Віктар Швед.

# Роднае Падляшша —
# малая Айчына наша

## Рэчаіснасць

У таўпе таўкуся
Нашых беларусаў.
Яны і глухія,
Яны і чужыя,
Калі скажу слова
На іх роднай мове,
Калі адазвуся
Наконт Беларусі.
Тут нашы „людкове”
Ўжо пані, панове,
Яны ў Беластоку
Палякі навокал.

## Дзіўны горад Беласток

Пастаянна мы знікаем,
Хоць нас можа тут палова.
Дзетак горстачка малая
Вывучае сваю мову.

Нам з таго не шмат карысці,
Гэта ж толькі кропля ў моры.
І якое ж маем выйсце,
Гэта сум наш, наша гора.

Тут імкненне ўжо такое,
Каб палякамі ўсе сталі.
Сядзім, як мышы пад мятлою,
Каб нас толькі не краналі.

Будучыня — нецікавай,
Штораз менш нас у краіне.
Відавочна неўзабаве
Тут і след па нас астыне.

## Райская птушка

У даваенны Беласток
Я прыязджаў са школай.
Перажываў сапраўдны шок
Ад усяго наўкола.

Браніцкіх парк нібыта рай
Тут успрымаўся мною.
Такая прыгажосць – зважай!
Было мне ўсё святое.

Горда праходжваўся паўлін
З хвастом нібы вясёлка.
Той птушкі райскай успамін
Мне напамінам колкім.

## Арлянская сінагога

Падзей жыццёвых было многа,
Год трыццаць сёмы на прыкмеце.
Мяне часамі ў сінагогу
Яўрэйскія вадзілі дзеці.

І быў надзвычай я шчаслівы
Малюнкі ўбачыўшы на сценах:
Ільвы з развеянаю грывай,
Як сімвалы уваскрашэння.

А ў трыццаць восьмым, небывалым, –
Пажару не дай Бог такога, –
Бачыў таксама як палала
Сярод дамоў і сінагога.

Збыліся страшныя падзеі,
Колькі ж зямелька пацярпела!
Злачынцы знішчылі яўрэяў
І сінагога апусцела.

Паўтысячную гадавіну
Дзеяння Орля адзначае.
А сінагога, хоць у руіне,
Ўсё вернікаў сваіх чакае.

*23 верасня 2007 года*

## Галакост

*Памяці Леі Юнгерман*

Яна ў трыццаць дзевятым
Ад фашыстаў крывавых
Уцякла, як з-за кратаў,
У Беласток з Варшавы.

Хоць без грашовых сродкаў –
Здалася непакорнай.
Яе ў дзесяцігодку
Накіравалі ў Орлю.

Як матэматык новы
Спраўлялася з прадметам.
Яго нас на белмове
Вучыла за Саветаў.

Угледзела, што лыткі
Зімой ссінелі трохі,
Дала мне ўвачавідкі
Ваўняныя панчохі.

Калі мне мерзнуць ногі
Ў зімовыя хвіліны,
Заўсёды ў сэрцы многа
Падзякі за ўчынак.

## Арлянская дзесяцігодка

Восенню ў трыццаць дзевятым,
Як прыйшлі да нас Саветы,
Уводзіць пачалі заўзята
Беларускую асвету.

З наваколля дзетак трыста
Сабралося ў школе новай.
Прывезлі спецыялістаў
З Мінска з веданнем белмовы.

І на працягу двухгоддзя,
Па месяц чэрвень у сорак першым,
Пісаў я пільна, амаль штодзень,
На беларускай мове вершы.

І ўпершыню я на эстрадзе,
Будучы падлеткам сельскім,
Прымаў удзел у алімпіядзе
Дзіцячай творчасці у Бельску.

## Ачалавечаныя дрэвы

У маляўніча-казачным ваколлі
Нарвы, санліва-ласкавай ракі,
Жыве сваёю незавіднай доляй
Загубленая вёска Канюкі.

У ёй над стромкім берагам пясчаным
Вырас таленавіты самавук,
З душой крылатай, сэрцам палымяным,
Разьбяр народны Валодзя Наумюк.

Тут у камлях драўніны цвёрдай мары
Здзяйсняе працай здольных рук сваіх,
Аднавяскоўцаў ажываюць твары,
Уваскрасаюць постаці святых.

О, колькі ж хараства ў разьблёных працах,
Які ж цудоўны гэта Божы дар!
Мы не маглі б бясконца захапляцца,
Калі б не тхнуў у іх душу разьбяр.

## З прадшколлем у раздоллі

У сядзібе Латышонкаў
Наша слаўнае Купалле
З беларускай песняй звонкай
Мы з прадшколлем сустракалі.

Нашы дзеткі, быццам кветкі,
Столькі ўнеслі весялосці.
Ды шкада, што вельмі рэдка
У Супраслі родным госцім.

Ды час няўмольны добрым сведкам:
Мы вырастаем і старэем.
З прадшколля нашыя ўжо дзеткі
Дайшлі да трэцяга ліцэя.

Тут вывучаюць сваю мову,
Гісторыю свайго народа.
І ведаюць абавязкова:
Беларусамі яны заўсёды.

## Сустрэча

Выпадае сцвердзіць гэтак:
Шмат пачуццяў найшчырэйшых
Маю я да школьных дзетак,
Ім пішу заўсёды вершы.

Крануты так нечувана
Пачуццём я чалавечым,
Што мяне так нечакана
Запрасілі на сустрэчу.

А прыемна мне тым болей,
І падкрэсліць гэта мушу,
Што тут у Чацвёртай школе
Вучыцца мая дачуся.

Цешуся, мяне сардэчна
Успрымалі на спатканні,
Добра слухалі, бясспрэчна,
Мноства задалі пытанняў.

Шмат сустрэч я меў навокал,
Дзе чытаў прысутным вершы,
Толькі ў школе ў Беластоку
Выступіў я раз найпершы.

*20 лістапада 1998 года*

## Наш мяккі знак

*Аліне Ваўранюк*

Наша мілая Аліна
Мовы роднае няспынна
Навучае дзетак так –
Каб цанілі мяккі знак.

Вучыць дзетак яна ў школе,
Не пагарджалі каб ніколі
Роднай моваю аднак,
Каб шанавалі мяккі знак.

Бо рэфарматары ад мовы
Мову знішчаць заўжды гатовы.
І з іх віны змякчэнняў брак,
Дзе быць павінен мяккі знак.

А дзеткі ў нас такія словы
Вымаўляюць правідлова.
Таму так многа ў нас падзяк
Аліне за наш мяккі знак.

*19 чэрвеня 2006 года*

## Наша дзесяцігоддзе

Свята ў беларускім асяроддзі,
Наша радасць хай плыве далёка!
Адзначаем мы дзесяцігоддзе
Навучання роднай мовы ў Беластоку.

Пачалося, як вядома, ад прадшколля,
Тут сышліся навучання карыфеі.
Навучанне разрастаецца з іх волі
Ў падставовай, у гімназіі, ліцэі.

АБ-БА тут як правадыр знайшлася,
Бацькоў нашых дзетак аб'яднанне,
На чале з ахвярнай надта Басяй.
Ёй якраз вялікае прызнанне!

Неацэннае значэнне педагогаў,
Дзесяць гераічных год Аліны!
Ім падзякі нашай вельмі многа,
Хай далей выконваюць павіннасць.

І таму мы можам ганарыцца,
У юбілей наш дзесяцігадовы,
Што ў малое айчыны сталіцы
Можам мы вучыцца роднай мовы.

*15 чэрвеня 2007 года*

## Беластоцкі „Манхатан”

Жыву я ў беластоцкім „Манхатане”,
На Дзесяцінах, ад былых палосак.
Жывуць тут у гурбе беластачане,
Што выйшлі з навакольных нашых вёсак.

Дзесяць паверхаў і пад’ездаў дзесяць,
Што маглі б скласці гмах стопавярховы
І хмарачос стварыўся б на Падлессі
І жыў бы ў ім нядаўні люд вясковы.

Ды замест жыць свабодна на палетках
У драўляных каляровых хатах,
Пасяліліся ў бетонных клетках
І ніхто ў нічым не вінаваты.

Немагчыма цвік убіць у сцены
І таму дрыля ўсе чуюць „спевы”,
Як бетон свідруе тут нязменна
Знізу, зверху, справа або злева.

Вінаватых тут няма, вядома,
Хоць і можа стан такі раз’юшыць.
Дзятлам кожны тут у сваім доме,
Можна толькі заткаць ватай вушы.

## У паўстагоддзе БГКТ

Дзейнічаюць паўстагоддзя
Штодзённа, плённа, карпатліва,
Клапоцячыся аб народзе
БГКТ і тыднёвік „Ніва”.

Працавалі мы няспынна,
Народ свой гуртавалі смела,
Сваю здзяйсняючы павіннасць
У гуртках нашых і аддзелах.

Ужо даўно аддзелы нашы
Не маюць памяшканняў, штатаў,
Аднак грамадска на Падляшшы
Працаў выконваем багата.

Дапамагаюць нам у працы
Нашыя ўлады штораз меней,
І сталі роднага цурацца
Ўжо маладыя пакаленні.

Адукавалася нам моладзь
І выехала хутка ў горад
І забывае свае сёлы,
Асімілюючыся скора.

Крадзецца ў вёскі нам пустэча,
Неўтаймаваная такая,
Працаю змучаны старэчы
Сумуюць там і уміраюць...

Калі стаем мы на парозе
Ужо другога паўстагоддзя –
Добра, што яшчэ песні возім
У нашае мы асяроддзе.

*26 лютага 2006 года*

## Я шчаслівы — паўвека з „Нівай”

*Супрацоўнікам і Чытачам „Нівы”*

Задаволены я і шчаслівы,
Мой творчы лёс спалучыўся з „Нівай”.
Я надта цешуся – адбыўся тут
Літаратурны мой дэбют.
А радасцю маёй найпершай –
Змясціў дзве тысячы з паловай вершаў.
Быў тут я штатным і няштатным,
Заўжды са шчырым словам братнім.
Папраўдзе ў „Ніве” менавіта
Майго ўсяго жыцця адбітак.
Мае артыкулы і лірыку, сатыру
Пісаў заўсёды сваім сэрцам, шчыра.
І пастаянна ў „Ніве”, аж да стомы
Пытаўся чытачоў шматлікіх: хто мы?
Адказваў надта шчыра, што клянуся,
Былі мы, ёсць і будзем беларусы!
І сэрца чулае сціскалася ад жалю,
Калі нас, быццам верныя, пакідалі.
І цешуся, што яшчэ нас многа
Гатовых да далейшае дарогі
Ідэй святлейшых, вернага змагання
За меншаснае наша існаванне.
Я пажылы ўжо, і таму нашчадкам
Жадаю „Ніву” бараніць як матку,
Каб асталіся вернымі народу,
Каб „Ніва” каласілася заўсёды!

*4 сакавіка 2006 года*

## Наш Юбілей

*Да паўстагоддзя творчай працы*
*Беларускага літаратурнага*
*аб'яднання „Белавежа"*

Пад Белавежай, на Падляшшы,
Мы аб'яднаны пажыццёва:
З айчынаю малою нашай
І з беларускім родным словам.

Здабыткаў многа ў нас трывалых,
Павінны гэтым ганарыцца,
І безліч творчага запалу,
І мар, якім каб толькі збыцца...

Планаў яшчэ ў мяне багата,
Розных няздзейсненых імкненняў.
У паўстагоддзі мой пачатак,
Аднак ніколі – завяршэнне.

Нёс творчую я эстафету
Надта напорыста і штодзень.
Юным перадаю паэтам:
– Нясуць яе хай да стагоддзя!

*8 чэрвеня 2008 года*

## Наша паэзія

*Niech poeci piszą wiersze*
*prostsze od wspaniałej poezji.*
*(Ks. Jan Twardowski)*

Кажуць, паэты згодны з модай,
Аб форму надта дбайныя.
Пішуць паэзію заўсёды
Цудоўна-надзвычайную.

Часта паэзія, вядома,
Заблытана-умелая,
Не падабаецца нікому –
Яна незразумелая.

А трэба чытачам найпершым
Пісаць не надта з модаю,
Ды так пісаць, каб нашы вершы
Былі ім асалодаю.

Каб вершы ў сэрцы гасцявалі
І з памяццю ядналіся,
Каб на паліцы не ляжалі,
Ды толькі скрозь чыталіся.

## Незвычайны будаўнік

*На адкрыццё*
*мемарыяльнай дошкі*
*памяці Кастуся Майсені*

Ты пасяліўся у музеі,
Тут на сцяне Твой светлы лік.
Ты светач наш і эпапея,
Музея слаўны будаўнік!

Здзяйсняў Ты ўпарта мары нашы
Ахвярнай працаю, Кастусь.
Цябе ўслаўляе ўсё Падляшша,
Цябе шануе Беларусь.

Музей – бясцэнная скарбніца,
Павінна багацець штогод.
Табою будзе ганарыцца
Заўсёды кроўны Твой народ.

І маладыя пакаленні,
Якія прыйдуць у музей
Скажуць, што Кастусь Майсеня
Музея слаўны карыфей.

*24 лютага 2008 года*

## Старасці плады

Калі ўжо нас гнятуць гады,
Нешта пабольвае няспынна,
Сваёй я старасці плады
Падсумаваць ужо павінен.

Я жыў з любоўю да людзей
І з радасцю, і дабрынёю.
Заўсёды поўны быў надзей
І разумення, і спакою.

Я вернасці заўжды шукаў,
Праўды і шчасця, і прызнання.
Ды многа горычы зазнаў,
Розных інтрыг, расчараванняў.

Сцвярджаюць, што старэйшы век
Дык гэта не жыцця змярканне,
Што калі творчы чалавек,
Тады ў нас мудрасці світанне.

## Басовішча

У меднастволым Барыку сасновым,
Пад расспяваным родным Гарадком,
Фестываль праходзіць маладзёвы,
Дзе студэнцкі БАС гаспадаром.

Фестываль, вядома, міжнародны,
Шмат на сцэне дарагіх сяброў,
Што спяваюць „Хочам жыць мы годна,
Без астрожных кратаў, ланцугоў”.

У суправаджэнні музыкантаў
Хлопцы бескампрамісна пяюць:
„Мы не хочам моваў акупантаў,
Калі маем родную сваю”.

Таўпіцца наша маладая змена,
Фестываль ёй надта дарагі.
Танцуюць разам з моладдзю пад сцэнай
Бел-чырвона-белыя сцягі.

## Хору „Арляне”

Да песні любоў
У Вас жыве штодзень.
Шэсцьдзесят гадоў
Вы заўжды ў народзе.

Тых гадоў не вярнуць,
У нябыту ўжо ценю.
У свет Арлянкай плывуць
Песні трох пакаленняў.

Няхай надалей
Плывуць песень словы,
Каб калісь юбілей
Святкаваць стогадовы.

Служыць хай землякам
Заўжды Ваша спяванне.
Многа шчасцейка Вам
Я жадаю, Арляне!

## Бандароўская гасцёўня

*У дзесятую гадавіну*

Ініцыятарам Гасцёўні
Быў наш нястомны Віктар Бура,
Які імкнецца, каб на ўзроўні
Нам развівалася культура.

Які настойліва, заўзята
Мабілізуе наваколле,
Каб сталася вялікім Святам
Гасцёўня з песняй і застоллем.

Плывуць вадой далёка спевы,
Хоць жар ліпнёвы разгарнуўся.
Прывозіць тут Валя Ласкевіч
Хары з Падляшша, Беларусі.

Няхай жа ў Бандарах Гасцёўня
Штогод гасцей усіх склікае
І нашай песняю цудоўнай
Усё Падляшша ўзбагачае!

*17 ліпеня 2010 года*

# Ад сэрца да сэрца

## Ад сэрца да сэрца

*Памяці Васіля Быкава*

Беларусь пасля няволі даўгавечнай
Атрымала Суверэнітэт.
Ажывае процьма мар адвечных,
Многіх пакаленняў запавет.

Ён у складзе дэлегацыі дзяржаўнай
Завітаў таксама ў Беласток,
Каб падзеяй падзяліцца слаўнай –
Вызваленне надышоў дзянёк.

Зборнік вершаў уручыў я госцю
І славутага пісьменніка рука
Клала, быццам дарагое штосьці,
Каля сэрца, у кішэню пінжака.

Па сустрэчы радасцю вялікай
Цешыўся, што ў гушчы розных спраў
Прысвяціў мне хвілю Васіль Быкаў,
Шчыра так са мной паразмаўляў.

*26 чэрвеня 1992 года*

## У сотую гадавіну

*Памяці Ларысы Геніюш*

Мінае час заўжды імклівы,
Сумуе гадавіны жыццяпісаў.
Прачытаў я допіс сёння ў „Ніве”
Аб стагоддзі Геніюш Ларысы.

Вядомая нам нараджэння дата
Паэткі, шанаванай тут заўсёды.
Таму мы аб’явілі год дзесяты
Ларысы Геніюш славутым годам.

Помніцца сустрэча з паэтэсай
У шасцідзесятыя ў Варшаве.
Расказала аб лагерным лесе,
Аб жыцця свайго шляху крывавым.

Надзвычай сумна, што ў вольнай краіне
І па смерці не мае прызнання
Паэтэса – сімвал – гераіня –
За волю непакорная ў змаганні.

*12 жніўня 2010 года*

## Памяці Канстанцыі Буйло

Хіба адзіны на Падляшшы
З літаратурнай сферы
Сустрэўся я з паэткай нашай
Ў яе маскоўскае кватэры.

Наракала на свой старэчы
Стан здароўя бесталковы,
Падпісала мне на сустрэчы
Зборнік паэзіі „маёвай”.

І быў надзвычай я шчаслівы,
Што лёс мне даў узнагароду.
Пісаў аб паэтэсе ў „Ніве”:
Будзе мне помніцца заўсёды.

У нас як гімн абавязкова
На розных святкаваннях пета
Песня на паэтэсы словы:
„Люблю наш край, старонку гэту”.

## Выгнаннік

*Яўгену Міклашэўскаму*

Ты, Даражэнькі Жэнік,
З роднай зямлі-калыскі
Быў вырваны з карэннем
З сям'ёю ў вёсцы Лыскі.

І ў горы нечуваным,
Што і дагэтуль сніцца,
Татулька Твой завянуў
Як Васілёк у жыце.

А дарагая Маці,
Дасведчаная гэтак,
Па свайго мужа страце
Гадуе трое дзетак.

І гэтым ганарыцца:
Здабыў сынок асвету,
Знайшоўшыся ў сталіцы,
Вядомым стаў паэтам.

Сынок у мінскай хаце
Здзяйсняў сваю павіннасць:
Апекаваўся Маці
Хварэючай няспынна.

Мінула нечакана
Сямідзесяцігоддзе.
Табе мая пашана,
Жыві, Друг, да стагоддзя!

*9 жніўня 2006 года*

## Вечны агонь

Мужная Галіна Дзягілёва!
Яе настойлівасць, адчай
Ўслаўляюць беларускай мовай
Наш васільковы родны край.

Хай расцвітае ідэя святая
І разлягаецца ў эфіры кліч:
Няхай лунае, не патухае
І асвятляе цемень „Зніч”!

*11 кастрычніка 2007 года*

## Каты — як людзі

*Мы пакрысе катамі*
*з камп'ютарнаю мышкай.*
*(Сяргей Стэльмашонак)*

Мы бачым на выставе
Шмат постацей кашэчых,
Якіх мастак цікава
Зусім ачалавечыў.

Ды нават коцік п'яны
З недапітай чаркай
Не страшыць нас заганай –
Алкагольнай, яркай.

Мы хітрасць і каханне
Бачым у вачанятах.
Катам шлем прывітанне
За наш настрой прыўзняты!

Выстава цешыць будзе
І павучаць таксама.
Часам каты – як людзі,
Мы пакрысе катамі.

*14 снежня 2009 года*

## Таленавітаму палешуку

Славуты Мікола Тарасюк
Уласнік залатых рук,
Якія шчыра, пастаянна
Людзей ажыўляюць драўляных.

Самавук, разьбяр, карыфей,
Стваральнік драўляных людзей,
Як ён сам працавітых вяскоўцаў,
Што моляцца ва ўласнай царкоўцы.

Так вельмі цешуся, што змог
Пераступіць я Ваш парог
І пазнаёміцца, адведаць.
Шчасця, здароўя Вам –
ад Шведа.

*14 красавіка 2010 года*

## Метамарфоза

У пяцідзесятыя гады
Дваццатага стагоддзя
Польскія ўлады тады
Закідалі беларускаму асяроддзю,

Што яго дзеячы
Быццам пад нейкім прымусам,
Намагаюцца далучыць
Беласточчыну да Беларусі.

А ў апошні ўжо час
Беларускія дзяржаўныя ўлады
Палякам сваім якраз
Закідаюць падобную здраду,

Што хочуць яны адарваць
Гродзеншчыну ад айчыны,
Каб Польшчы яе перадаць,
Як сваю павіннасць.

## Чаму Беларусь рускамоўная?

Беларусь сёння ўжо незалежная,
Ды яна штораз менш беларуская.
У ёй моцныя ўплывы замежныя
І дзяржаўнаю тут мова руская.

Таму сэрца маё суму поўнае,
Чаму так у нас бесталкова?
Чаму Беларусь рускамоўная,
Калі маем уласную мову?

Прапаганды ўсялякае поўна.
Тут варожасцю сыплюць у вочы,
Што народ наш ужо рускамоўны,
Беларускае мовы не хоча?

Рускамоўнасць ў краіне свабоднае
Пашыраюць дзяржаўныя ўлады.
Дык ці ж будзем паэзію родную
Чытаць толькі у перакладах?

## Лятучы ліцэй

Як велікан, карыфей
Працуе паспяхова
Гуманітарны ліцэй
З беларускаю мовай.

Ва ўлад выклікае жах,
Ён – беларускамоўны!
Ліцэю забралі гмах
Да ліквідацыі поўнай.

Стаўся ліцэй лятучым
Па свеце неўзабаве.
Дзетак з Мінска вучаць
У Вільні і Варшаве.

Дзейнічае надалей
Мінскіх улад крамола,
Гэты лятучы ліцэй,
Партызанская школа.

## Наш Новы Запавет

Мы беларускага народа
На Беласточчыне часціна,
Таму нам Беларусь заўсёды
Будзе айчыннаю краінай.

Хоць гістарычную Пагоню
І сцяг знішчаюць ашалела,
Веру, што герб наш абаронім
І сцяг наш бел-чырвона-белы.

І беларускай роднай мовы
Не адцураемся ніколі.
Памерці за яе гатовы,
Мы жыць не хочам у няволі.

Мы кажам: вольнай Беларуссю
Заўжды, народзе, ганарыся!
Ніхто ніколі не прымусіць
Нас ад Айчыны адрачыся!

## Дваццаць Пятага Сакавіка

*У 90-тую гадавіну абвяшчэння*
*Беларускай Народнай Рэспублікі*

У васемнаццатым ваенным годзе,
Калі народ штодзень крывавіць мусіў,
Прага мацавалася ў народзе:
Адрадзіць дзяржаўнасць Беларусі.

Рада БНР апавясціла
Незалежнасць роднае Айчыны.
З'езд Саветы разагналі сілай,
Захапіўшы вольную краіну.

І пачаліся страшныя расправы
Над членамі народнае улады
І перастала існаваць дзяржава,
Народная Рэспубліка і Рада.

А ў Беларусі, незалежнай ужо сёння,
Знішчае улада так як мага,
І БНР, і гістарычную Пагоню,
Ды разам з бел-чырвона-белым сцягам.

Хоць перашкод так заўсягды багата,
Жыццё імчыць як бурная рака.
Я веру, усенародным будзе Святам
Дзень Дваццаць Пятага Сакавіка!

*25 сакавіка 2008 года*

# Заўсёды добрыя жанчыны жывуць у сэрцы, ва ўспамінах

## Калядны санет

*Еве Данэйка*

У „Пану Тадэвушу” Адам Міцкевіч
Прыгожа прадставіў Давэйку і Дамэйку
І хоць не ўспамінае ён пана Данэйкі
На ловах той Данэйка мог быць паміж дрэваў.

Калі сёння святкуем двухсотыя ўгодкі
Мы з дня нараджэння вешчуна-паэта,
Ведаем, што таксама імяніны гэта
Усіх Адамаў, нашчадкаў славутага продка.

Ведаем, што з Адамам выступае Ева,
Што, як іншыя жанчыны, яго паланіла.
Сёння я прысвячаю калядныя спевы

Нашай Еве, чароўнай і надзвычай мілай.
Хай жыве нам у шчасці дзетак каралева
І няхай нам іх вучыць, як дасюль вучыла.

*24 снежня 1998 года*

## Анёл і дэман

Ты ружавым букетам
І цэлым маім светам.

Ты зоркай залатою
І роспаччу, тугою.

Ствараеш прагу моцы,
Сну пазбаўляеш уночы.

Ты грозная пачвара,
Мая святая мара.

Ты гордая хітруха,
Або з пакорай, скрухай.

Ты анёл або дэман,
Маральная дылема.

Ўсім пакрысе бываеш –
Такую я кахаю.

## Незабудкі

Мой дом ужо далёка,
Ў купэ я адзінокі.
Ды не зусім я гэткі –
Са мною едуць кветкі.
Не адарваць мне зроку
Ад кветак сінявокіх.
У слоіку ціхутка
Едуць незабудкі.
Яны давольны быццам
І просяць не забыцца
Маёй каханай Ані.
Яна на развітанне
Прыйшла ў вагон са смуткам,
Прынесла незабудкі.

## Збылася мара

*Валянціне*

Доня Зосінай сястрыцы
Мужа вынайшла са Швецыі.
Разважалася ў Тайніцы:
Надта добра ёй жывецца.

Вучаніца Валянціна,
Што з бацькамі жыла бедна,
Марыла: – Мо я павінна
Знайсці таксама мужа Шведа.

Раптам вынікла крамола.
Лёс складаны чалавечы.
Прыязджае Швед у школу.
Не папала на сустрэчу…

Розным шляхам шчасце ходзіць.
Споўнілася мара Валі:
Мы сваё дваццацігодзе
З гонарам адсвяткавалі.

І хоць Швед не скандынавам,
Ён мясцовы, ён адгэтуль.
Хоць з багаццем нецікава,
Ды затое – ён паэтам!

## Наце гадоў дваццаць

Доня імкнулася няспынна,
Каб быць дарослаю дзяўчынай.
Сказала цвёрда: па матуры
Я выбрала архітэктуру.

І нарадзіўся тут варунак:
Здаць матэматыку, рысунак.
І з гэтым справілася Доня,
Яна студэнткаю ўжо сёння.

А вынікаў няма без мукі,
Прад Ёю пяць гадоў навукі,
Каб атрымалася з эфектам,
Магла сказаць: я – архітэктар!

І гэтага ў гадочкаў дваццаць
Жадаюць Доні бацька, маці.
Няхай у Нараджэння Свята
Здзяйсняюцца ўсе мары Наты!

*15 верасня 2010 года*

## Тры пакаленні

Мне восемдзесят пяць, – сказалі, –
І боязна прызнацца.
Шэсцьдзесят год маёй Валі,
А дваццаць доні Наце.

Наша сям'я – тры пакаленні
У гарадской кватэры.
Бываюць непаразуменні
І недахоп даверу.

Ды памяркоўныя мы людзі –
Знаходзім выхад нейкі.
Таму скажу: мы ёсць і будзем
Разважнаю сямейкай.

Жывем мы з Валяй і Наталляй
У еднасці сямейнай, згодзе,
Нядаўна мы адсвяткавалі
Супольнае дваццацігоддзе.

## Як добра, што ты ёсць

Мы бачымся так рэдка,
Ты мой нядзельны госць.
Цешыць і спосаб гэткі –
Як добра, што ты ёсць.

Цяжкі лёс чалавечы,
Мінула маладосць.
Душу ўжо трэба лечыць –
Як добра, што ты ёсць.

Калі цябе я ўбачу –
Мінаюць сум і злосць.
Сустрэчы нашы ўдачай,
Як добра, што ты ёсць.

А голас твой пачую –
Якая прыгажосць!
Кахаю і шаную,
Як добра, што ты ёсць.

***

Душа мая кроўная,
Натхнення поўная,
Люблю, абагаўляю.

Ты ідылічная,
Ты і лірычная,
Ты і мяне кахаеш.

Не адзінокі я,
Струёй шырокаю
Паэзія бруіцца.

Што яшчэ здарыцца?
Так многа марыцца,
Каб толькі марам збыцца.

## Сяброўства

**С**яброўства дадзенае Богам –
**В**еліч пачуццяў і надзей.
**Я**но да сэрц людскіх дарога,
**Т**рэба любіць, кахаць людзей.
**Л**аска і дабрыня яднае,
**А** без любові – жыць дарма.
**Н**іхто не любіць, не кахае,
**Е**днасці ў нас калі няма.

## Нашы жанчыны

У нашым веку маладым
Шукаем мы жанчын заўжды
Прыгожых, быццам з неба,
На нашыя патрэбы.

І ўжо з жанчынай нашых мар
Вянчае слаўна нас святар,
Ды раптам прыкмячаем,
Што гэта ўжо не тая.

І лаянкі і сваркі
Канфлікт народзяць яркі.
І ў гэтай безнадзеі
Мы мучымся, сівеем.

І ведаем, што здаравей
Жанчыну мець у галаве,
Чымсьці безупынку
Трымаць яе ў абдымках.

# Нарадзіўся, памёр, уваскрос, каб паправіць чалавецтва лёс

## Раджджаство Хрыстова

Усявышні Нараджэнне
Здзейсніў Сына ў Віфляеме,
З думкаю аб выбаўленні
Ад грахоў людскога племя.

Молім мы Цябе няспынна,
Усяўладны наш Ісусе,
У сапраўдным памажы нам
Адраджэнні Беларусі.

Каб народ наш жыў заўсёды,
Не расплыўся, не загінуў,
Памажы майму народу
Мову захаваць, Айчыну.

## Спявайма калядкі

Бог людзям паслаў з Нябёс
Божае Дзіцятка.
Нарадзіўся нам Хрыстос –
Паплылі калядкі.

Спіць на сене ў яслях Ён,
Пад апекай Маткі.
І яму з усіх старон
Чуюцца калядкі.

Спі, наш Збаўца, наш Тварэц!
Хлопчыкі, дзяўчаткі
Будуць заўжды Табе пець
Слаўныя калядкі.

З васьмікутнаю звяздой,
Ад хаткі да хаткі,
Ўсе мы пойдзем грамадой
Праспяваць калядкі.

## Калядны сон

Нашы Калядныя святы
Сон прынеслі мне багаты.
Мне прысніўся ўзрост мой ранні,
Слаўнае калядаванне.

За сталом дзяцей грамадка,
Мы развучваем калядкі.
Са звяздою, на змярканні,
Пачалі калядаванне.

Пад акенцамі хацінак
Божага ўслаўляем Сына.
Не пужае нас мароз –
Нарадзіўся нам Хрыстос!

Я, здаецца, толькі ўчора
Апынуўся ў вёсцы Мора.
А на жаль – лічы назад –
Год прайшло восемдзесят.

Сталася ў душы маркотна,
Час мінае беззваротна.
Азвалася доня Натка:
– Будзем мы спяваць калядкі!

## У калядную ноч

У нашых вёсках цудаў
Няма нат і ў Каляды.
Сярод старога люду
Уміраюць і абрады.

Выязджаюць у горад
Юныя пакаленні
І забываюць скора
Вясковую адменнасць.

Хутчэй на роднай мове
Азвецца ўжо жывёла,
Чым „новыя панове”,
Нашая моладзь з сёлаў.

## Хрыстос Уваскрос!

Як штогод, як заўсёды,
Уваскрасае нам прырода.
У гэты час Уваскрос
І наш Святы Ісус Хрыстос.

І надта цешаць, безумоўна,
Падзеі гэты шчасця поўны:
І прыроднае квітненне
І Хрыстова Ўваскрашэнне.

У прыродную абноўку
Усе пойдзем у царкоўку.
З прагай адрадзіць наш лёс
Уваскрос Ісус Хрыстос!

## Ушэсце

Вясна! Цудоўная пара,
Усенька ў развіцці, квітненні.
Нішто не думае ўміраць,
Прырода ў стане ўваскрашэння!

Збавіцель наш, Ісус Хрыстос,
Які за нас пакутаваў многа,
Таксама з мёртвых уваскрос,
Каб потым узысці да Бога.

Пасрэднікам каб стацца мог
Ён паміж небам і зямлёю,
Пазваў Хрыста ўладарны Бог
У царства вечнае, святое.

Вучняў узрадаваў Хрыстос
І хрысціян зямной планеты.
Узнёсся ў славе да нябёс,
Як Божы Сын, Збавіцель свету.

## Падзяка і просьба

Дзякуй Табе, Божа,
За сонейка прамень,
За кожненькі прыгожы
Пражыты мною дзень.

Так не цаніў ніколі
Ранейшага жыцця,
Пакуль дайсці не здолеў
Да грані небыцця.

І тут я нечакана
Зрабіў жыцця падлік:
Ёсць яшчэ справы, планы,
Якіх я не пранік.

Таму, мой Божа мілы,
Хачу Цябе прасіць:
Дай мне здароўя, сілы,
Каб мог яшчэ тварыць.

## Новыя алтары

У другой палове прошлага стагоддзя
Маім заданнем у жыцці найпершым –
У роднае прыехаць асяроддзе,
Сялянам-беларусам чытаць вершы.

З сардэчным сустракаўся я прыёмам
І вершы успрымалі з захапленнем.
Мяняліся абставіны, вядома,
Прыходзілі на змену пакаленні.

Спыніліся сустрэчы з землякамі
І вершам не хапае ўжо даверу.
Прад тэлевізарамі-алтарамі
Вясковыя тырчаць пенсіянеры.

## Праваслаўныя могілкі

У апошнюю праводжу я дарогу
Сваякоў, сяброў сваіх, знаёмых.
Як жа тут памерршых многа, многа...
Што, каб маглі, сказалі б: „мы ўжо дома”.

Сярод магіл блукаю адзінока,
Тут штораз больш усё мяне цікавіць.
Якая ж спальня сумная навокал!
І мой спачын тут будзе неўзабаве.

Бачу, знікаюць з намагільных плітаў
З нябожчыкамі звязаныя словы,
З кірылічным, нам блізкім алфавітам,
І з нашай роднай беларускай мовай.

Калісь тут прыйдуць нашыя нашчадкі
І на магілах расшыфруюць знакі.
Народзіцца тады такая згадка:
Ляжаць тут праваслаўныя палякі.

## Смаленск

*Памяці 96-ці ахвяр*
*авіяцыйнай катастрофы*

Удар.
Кашмар.
Катынь.
Амінь.

*10 красавіка 2010 года*

# Ідуць гады,
# бягуць гады
# і заціраюцца сляды

## Разважанні

Васьмідзесяцігоддзе
Спрэчная даволі дата.
Цешымся пры той нагодзе,
Што пражылі гадоў багата.

Сумуем мы адначасова,
Што позняя настала восень,
За намі ўжо жыцця аснова.
І так нямнога засталося...

## Роздум

Калісьці быў я малады,
Вучыўся ў пачатковай школе.
Прайшлі маланкава гады,
І ўжо не вернуцца ніколі.

Звыш сотні дрэмле ўжо гадоў
Школа вясковае навукі.
Вучылі нашых тут бацькоў,
А потым дзетак іх і ўнукаў.

І назаўсёды губіць след
Род не адзін у вёсцы Мора.
Таксама ўжо апошні Швед
Пражыў свой век страшэнна хворы.

Старэе вёска на вачах,
Штораз часцей знікае хтосьці.
Апошні перад кожным шлях:
Злажыць каб косці на пагосце.

## Этапы прамінання

Шпіталь азваўся вінавата:
У хаце ўміраць ваш хоча тата.

Ашаламіла тэлеграма:
Спяшайся. Адыходзіць мама.

Сумная вестка данясласся:
У вечнасці ўжо швагер Вася.

Ізноўку сумная хвіліна:
Пакінула свет сястра Ніна.

І яшчэ, з блізкіх мне на свеце, –
Развітанне з братам Пецем.

Смутак агортвае дазвання:
Я ж на этапе прамінання.

***

Сумны лёс мой,
Хандра і сплін.
У масе людской
Я сам адзін.
У душы маркотна,
Я самотны.

## Наш лёс

Адыходзяць сяляне няспынна
Старыя, старыя.
Сумуюць па іх труны-хаціны
Пустыя, пустыя.

Нашы родныя бедныя вёскі
Знікаюць, знікаюць.
Дзірваном зарастаюць палоскі
І гаем, і гаем.

Мы чамусьці ад роднае мовы
Нямыя, нямыя.
Ловім заўжды суседнія словы
Чужыя, чужыя.

І мы часта не ведаем: хто мы?
Як дзеці, як дзеці.
І таму мы так мала вядомы
На свеце, на свеце.

***

Мы шагаем па родным краю,
Як пілігрымы быццам.
Штораз глыбей мы ўрастаем
У родную зямліцу.

Паўсталі мы з зямелькі шэрай,
Што дзіўнае такое.
Надыдзе час, у гэта верым,
Зноў станемся зямлёю.

***

Ідуць гады, бягуць гады
І утрымаць іх немагчыма.
Мае аднагодкі сівыя дзяды,
Цяжар жыцця нясуць за плячыма.

А колькі ж такіх, што няма ў жывых,
Пасяліліся ўжо на пагосце.
Час пакліча ўсіх і далучыць да іх,
Не ўцячэм ад смерці-ягамосці.

## Наша жыццё

На свет прыходзіць чалавек
Парадаксальна: каб памерці.
І праз увесь зямны свой век
Заўсёды думаем аб смерці.

На тры этапы падзяліць
Можам свае зямныя мукі.
Трыццаць год трэба прысвяціць
На ўсе забавы, на навуку.

Другія трыццаць трэба нам
Прызначыць на сям'і ўтрыманне,
На помач дарагім бацькам,
На ўласных дзетак выхаванне.

Частка апошняя жыцця –
Час нашых роздумаў аб гэтым,
Што шлях вядзе да небыцця,
Навечна сыдзем мы са свету.

## Ільняны алей

*Памяці Мацея Кураня*

Кухні наш знаток вялікі
Адказаў нам без маны,
Што яму з алеяў ліку
Найсмачнейшы ільняны.

І я згодны з тым, вядома,
Вось у мой дзіцячы ўзрост
Быў алей ласункам дома,
Асабліва ў доўгі пост.

Алей з цукрам на талерцы
Мама ставіла на стол.
Як жа цешылася сэрца,
Колькі ж радасці наўкол!

І свайго я брата лаяў,
Хоць, вядома, без патрэб,
Што за часта ён мачае
У алей аржаны хлеб.

## Ляўша

У санаторыі абедзеннай хвілінай,
Пры стале, што быў таксама мой,
Угледзеў пажылую я жанчыну
Што супок ела леваю рукой.

Звяртаць увагу мне было нязручна,
Ды проста ад душы азваўся я:
– Бачу, таксама пані леваручнай,
Як і дачушка родная мая.

Аднак калі жанчына па абедзе
Ледзь паднялася ад нашага стала,
Тады я толькі са смуткам угледзеў,
Што па паралічы яна была.

І папрасіў тады я прабачэння,
За тое, што прызнаў яе ляўшой,
Каб больш мяне не мучыла сумленне,
Каб не хварэў я сэрцам і душой.

*18 жніўня 2007 года*

## Нікіфар

Без прозвішча, без году нараджэння
Пражыў жыццё Нікіфар.
Ён у малюнкі пераліў імкненні,
Па смерці стаўся міфам.

Лэмкоўскае старонкі маляўнічасць
Яго запаланіла,
І чэрпаў з жыватворчае Крыніцы
Натхненне, вобраз, сілы.

І зносячы жабрацкія варункі
Пад сваім родным небам,
Турыстам каляровыя малюнкі
Дарыў за лусту хлеба.

Ды не памерла творчая ідэя
І сэрца жар няспынны.
Цэняць як скарб сусветныя музеі
Нікіфара карціны.

## Два моры

Маё ты айчыннае Мора,
Мая беларуская вёска.
Замест вадзяное прасторы
Шумяць збажжавыя палоскі.

У горад плыве з вёскі моладзь,
Як грозная хваля марская.
Сум узрастае наўкола,
Сяляне ўміраюць, ўміраюць.

І я, пажылы ўжо і хворы,
Лячыцца прымушаны сёння
Прыехаў у санаторый,
У „Воднік” – Марскія Устроні.

За вокнамі Балтыка плача,
Восень уздыбвае хвалі.
І дзе ж мне злавіць удачу,
І дзе ж мне пазбегнуць жалю?..

*12 лістапада 2007 года*

## Васількі

У беларускім нашым народзе
Было заўсёды многа Васількоў.
Тым папулярным імем праз стагоддзі
Хрысцілі людзі дарагіх сынкоў.

І уміраюць Васількі старыя,
А сярод іх любімы швагер мой.
А дзе ж, скажыце, Васількі малыя?
Не знойдзем іх, як кажуць, са свячой.

Ужо дзяцей не хрысцяць Васількамі,
Нямодным стала гэтае імя.
Каб з модным імем сталіся панамі
Іх дзеткі – марыць кожная сям'я.

Нам асталіся васількі у жыце,
Што расцвітаюць летняю парой.
Мы акунаем зрок у іх блакіце,
Іх услаўляем сэрцам і душой.

## Я не асенні, а вясенні

Жыццё плыве так хуткацечна,
За годам адыходзіць год.
На свеце мы жывём не вечна,
Усім намечан адыход.

Толькі не ведаем ніколі
Калі наш скончыцца маршрут.
Калі мы з болем, ці без болю
Пакінем свой айчынны кут.

Мінуў я пару пакаленняў,
Канулі ў вечнасці гады.
Я не асенні, а вясенні,
Яшчэ душою малады!

# Уваскрасае нам прырода, а мы старэем з кожным годам

## На Гданьскім узбярэжжы

Мяне на Гданьскае ўзбярэжжа
Міхась, мой верны друг, прывёз.
Пляж задрамаў пад снегам свежым
На ім іскрыцца ўжо мароз.

Няма на моры зыбкай хвалі,
Як люстра вадзяны прасцяг.
Маячыць цьмяна судна ў далі,
Што выплывае ў водны шлях.

А лебедзі, як снег той белы,
Агромністаю чарадой
Стаяць маўкліва, анямела,
Над мора зімняга вадой.

Спакойныя яны надзіва,
І не хвалююцца нічым,
Чакаюць жа сваёй спажывы,
Што людзі прынясуць мо ім.

Ныраюць лебедзі за нечым,
Сцякае з іх вады струмень.
Няма ім быццам халадэчы,
Нібыта летні маюць дзень.

Настрой тут родзіцца прыўзняты,
Хоць я хвілінны толькі госць.
Не маем фотаапарата
Увекавечыць прыгажосць.

## Чалавек і прырода

Ізноўку я у вёсцы Мора
У Велікодныя святы.
Тут умірае брат мой хворы,
Вартаўнік бацькоўскае хаты.

Прырода бушуе наўкола,
Яна надрабляе час весні.
Гудуць працавітыя пчолы
У квецені стройнай чарэшні.

Так часта ўмірае тут хтосьці,
Аджыўшы свой век чалавечы.
І больш мерцвякоў на пагосце,
Чым на зыходзе старэчаў.

Штогод ажывае прырода,
Заўсёды яна маладая.
А людзі тут з кожным годам
Старэюцца і уміраюць.

## Ільняны блакіт

Неба ўпала на палетак,
Прыгажосць вясняных дзён.
Безліч тут блакітных кветак,
Расцвітае слаўны лён.

Мроіцца з гадоў дзіцячых
Хараство сялянскіх ніў.
Тут цяпер зусім іначай,
Выклікае сум і здзіў.

Ужо ільну ніхто не сее,
Сялян не апранае ён.
Ператвараць яго не ўмеюць,
Непатрэбны вёсцы лён.

Толькі ў дзіцячых успамінах
Ільну блакіт мой цешыць зрок.
І гэта толькі напамінак,
Што мы вырошчвалі лянок.

## Палявая груша

Калісь, на бацькавых загонах,
Каля дарогі невялічкай,
Расла з разложыстаю кронай
Ігруша палявая, дзічка.

Яна абдорвала гасцінна
Усіх салодкімі пладамі,
А іх у вёсцы беспрычынна
Сяляне звалі шведаўкамі.

З сям'ёю бацька мой, Мікіта,
Шукаў пад грушай ахалоды,
Калі сярпамі жалі жыта
У спёку летнюю заўсёды.

Дупло ігрушы стогадовай
Ва ўсіх цікавасць выклікала,
Грамадка пастушкоў вясковых
Там вогнішча сваё расклала.

Стаяла восеньская суша.
Таму з агромністаю кронай,
Са спелымі пладамі груша
Шугала полымем чырвоным.

А неўзабаве груша тая
Ужо дымела вугалькамі.
Ды ў снах маіх яна вітае
Мяне з пладамі шведаўкамі.

## Ліпа

Кажуць, быццам ад стагоддзяў
Расла ў вёсцы Мора ліпа,
Надта важная ў народзе,
Абаронца наш ад грыпу.

Наша ліпа, добра помню,
Распасцерла голле-рукі
І лавіла сонца промні
Штодзень над вясковым брукам.

І заўжды спякотным летам
Так звычайна, па-сяброўску,
Жоўта-залацістым цветам
Адурманьвала ўсю вёску.

Я тады, малы хлапчына,
З торбачкай малой на шыі,
Улазіў аж на верхавіну,
Зрываў цвяточкі залатыя.

Калі зімою нечакана
Прастудзіўся хтось часамі,
Ён ліпавы цвет піў духмяны,
Які запарвала нам мама.

Патрапілі аднак разбурыць
Сужыццё з ліпаю скандалы.
Снапы з высокіх надта фураў
Галлём-рукамі яна крала.

Старую нечакана ліпу
Распілавалі ўжо сяляне.
Часцей хварэюць яны грыпам,
Пахам іх ліпа не дурманіць.

## Ноч над морам

Выплыў з вадзяной прасторы
Поўны месяц залацісты.
Выкупаўся ў цёплым моры,
Стаўся крысталічна-чысты.

І павіснуў у паветры,
Быццам лямпа Аладына.
Заглядае ў мора нетры,
Як у люстра гладзь жанчына.

Заблішчэлі звёзд каралі,
Астывае пляж да ранку.
І ціхутка мора хвалі
Зашумелі калыханку.

Засынае ўсё навокал
У надморскае старонцы.
Толькі месячыка вока
Выглядае стрэчы з сонцам.

## Салаўіныя ночы

Не магу я заснуць цвёрдым сном,
Не магу я самкнуць свае вейкі.
На сасне за пакоя акном
Так прыгожа пяе салавейка.

Я заслуханы поўнасцю так,
Хоць па траўме ляжу у пасцелі.
Ды заснуць не даюць аніяк
Салаўіныя звонкія трэлі.

Прамінуў цёплы чэрвеньскі дзень,
У нябыт ён кануў зноў без толку.
Салаўіная ноч сыпле цень
У лясны санаторый „Вясёлка”.

## Зязюля

Зноў мяне прывітала зязюля
У прыгожым масіве лясным.
Павучала калісьці матуля:
Гады лічыць зязюленька ўсім.

А нам трэба ўслухоўвацца толькі
І зязюленькі ку-ку лавіць.
Нам заўсёды адказвае толкам
Гадкоў колькі на свеце нам жыць.

А, вядома, яшчэ крыху грошай
У кішэні мець трэба тады,
Каб жыццё было заўжды харошым,
Каб не ведаць галечы, бяды.

І не маю турбот я з грашыма,
Іх яшчэ мне дагэтуль стае.
Маю многа гадкоў за плячыма,
А зязюля яшчэ ўсё куе.

## Камары

Ля санаторыя ў бары
Загудзелі камары.
Яны пачулі свой улоў –
Свежую людскую кроў.

Вось першы камарыны ўдар
У мой адкрыты цалкам твар,
Які пячэ, як у агні,
Ад яду грознай камарні.

Праз фортачку начной парой
Яна ўціскаецца ў пакой.
І моцна б’е рука праз сон.
Бы смокча не камар – а слон.

*Санаторый „Вясёлка”*
*Рэспубліка Беларусь*

## Аўгустаў

Аўгустаў – маляўнічая мясціна,
Частуе ўсіх людзей паветрам чыстым.
З усёй краіны едуць тут няспынна
Людзі у санаторый і турысты.

У пажылых гадах часцей я хворы
І дапамогі ў лекараў шукаю.
Папаў у аўгустоўскі санаторый,
Дзе я лячуся і адпачываю.

Жыву над Нэцкім возерам прыгожым,
У Аўгустоўскай пушчы лёгкакрылай.
Тут мой лячэбны побыт дапаможа
Захаваць яшчэ канчаткі сілы.

І шырокім новым тратуарам,
Узбярэжжам вадзяной прасторы
Я вандрую з рамантычнай марай
У Аўгустаў – прамяністы горад.

*20 жніўня 2007 года*

## Каламбуры

Жніва надышла пара,
Па ліўні ў полі пара.
А на ступнях сялян кара,
Як быццам Божа кара.

Са збожжа ападзе раса,
Зярняты добрай расы.
Пакуль раса, касі каса,
Пакосіш – будзе каса.

Тут невялікая рака,
Дзеці шукаюць рака.
Са збожжа будзе ў нас мука,
Яе здабыча – мука.

У рэчцы цёплая вада,
Забруджаная, з вадай.
І штораз горшая яда,
З хіміяю, з ядам.

# Аб жыцці шчыра ў святле гумару і сатыры

## Вяселле з пахмеллем

Быў я ў Козліках на ўзлессі
Госцем Нінкі і Алеся.
Дамоў ехаў з іх вяселля
Я з суботы на нядзелю.

Склалася так нецікава,
Што праехаў я й Варшаву.
І хоць верце, ці не верце,
Абудзіўся аж у Заверці.

Быццам і невінаваты
Зноў вяртаўся я дахаты.
Вось пахмелле дык пахмелле!
Будзе помніцца вяселле.

*15 мая 1988 года*
*ў цягніку з Заверця*

## Carpe diem!

На лукулаўскі абед
Прыйшоў з сям'ёю Віктар Швед,
Згодна з гасцінай – выпю, з'ем,
Carpe diem!

Прыходзь шумліва „Белавеж”,
І што дадуць – дык пі і еж,
Бо што даюць, тое бярэм,
Carpe diem!

Наш старшыня і наш паэт
Фундзіць лукулаўскі абед,
Дык мы шчаслівыя ідзем,
Carpe diem!

Створым святочны карагод,
Уславім разам Новы Год,
Дружнай сям'ёю запяем,
Carpe diem!

## Чаму ты так доўга жывеш?

Здавалася б, што „Белавеж”
Усіх „белавежцаў” яднае.
– Чаму ты так доўга жывеш?” –
Сакрат мяне часта пытае.

– Ці ж я замінаю табе? –
Адказваю заўжды Сакрату.
З нікім не жыву ў барацьбе,
Нікому не вінаваты.

– Я, Віктар, не дажыву
Твайго пажылога веку.
А хочацца жыць наяву,
Памерці старым чалавекам.

Як зразумець акурат
Думкі Сакрата, паверце,
Каб жыць мог Яновіч Сакрат
Ці ж Віктар павінен памерці?

## Забіць час

У горадзе
Жыве ён у самоце.
Ён з моладзі –
Бяздзейны па рабоце.

Наш тэлефон
Раптоўна засігналіў.
Азваўся ён
З уздыхам поўным жалю:

– Прыйду да вас, –
Сказаў ён у адчаі,
– Забіць каб час,
Інакш хіба сканаю.

Падумаў я:
Якія ж беспарадкі,
Мая сям'я
Мае заўжды заняткі.

Забіць каб час –
Таго я не ўспрымаю.
Ён жа ад нас
Маланкава ўцякае.

## Ці можна і ці варта?

Ці можна жыць бяззубым?
Уставяць нам ласкава,
І будзе глянуць люба,
І будзе ўжо па справе.

Ці можна жыць без сексу?
Дык можна ж, вядома.
Скажу я тут з рэфлексам:
Спачуваць такому.

Ці можна жыць без чаркі?
Дык можна таксама.
Жыццё імчыць так шпарка,
Не кульнеш з сябрамі.

Ці можна жыць без сэрца?
Напэўна немагчыма.
Працуе аж да смерці,
Пакуль мы шчэ жывымі.

Сэрца мець трэба, паверце,
Бо скажуць – гэта скупасць,
Жыве ўжо ён без сэрца,
Жывым ужо ён трупам.

Дык могуць быць сумненні
І сцвярджэнні ўпарта:
Як толькі адрачэнняў –
Ці жыць наогул варта?

## Чыноўніцкае крэсла

Ніхто не ваюе, цікава,
За крэсла ў роднай хаце.
Можна сядзець і на лаве,
На табурэце, ці маце.

Аднак безупынна ваюем
Мы за чыноўнікаў крэсла.
І абстаноўку такую
Ніколі не зменім, хоць трэсні.

На гэтым крэсле, так слаўным,
Чуйным быць мусім, як сокал.
Кожны павінен быць спраўным,
Бярэч крэсла, як зрэнку вока.

У крэсле драмаць падчас працы
Забараняецца строга.
Яго, трэба нам спадзявацца,
З-пад задніцы выхапіць могуць.

Шануйма цудоўнае крэсла,
Чыноўнікаў усіх аснову!
Яно многім шчасце прынесла
У іх дасягненнях жыццёвых.

## На Цэнтральным у Варшаве

Пасажыраў шмат тоўпіцца
На Цэнтральным у Варшаве.
Я наведваю сталіцу
Толькі ў нейкай важнай справе.

Еду пасля спраў дахаты,
Прыпыніўся на вакзале.
Каля нас людзей багата,
Перапоўненая зала.

У чарзе стаю гадзіну
І білет купіў нарэшце.
Міні-бар гудзе няспынна,
Тут я сеў, каб нешта з'есці.

Столікі, як той канвеер,
Прапускаюць тут кліентаў.
Кружыць цыганё з надзеяй:
Мо дадуць што з гэтай ленты?

Спажываюць людзі хутка,
Ад'язджаюць зноў з вакзала.
Рогат п'янай прастытуткі
Скалыхнуў раптоўна залай.

Абяздолены старэча
У кашы зарыўся носам.
Пажывіцца хоча нечым,
Злізвае кардонны посуд.

Ціснуся ў вагонным віры,
Здабыць месца ўсіх трывожыць.
Шмат яшчэ ўсё пасажыраў,
Хоць каштоўным падарожжа.

# Мы без народа, роднай мовы

*Удзедьнікам IV З’езда*
*выпускнікоў і выхаванцаў*
*Бельскага беларускага ліцэя*
*імя Браніслава Тарашкевіча*

Мінула ўжо і паўстагоддзя
Нашага роднага ліцэя.
Ды хто ж нас ведае ў народзе,
Якою мы жывем ідэяй?

Нас болей тысяч трох па ліку,
Даўняе моладзі вясковай.
А хто ж з нас з колькасці вялікай
Не пагарджае роднай мовай?

Мы ўжо ў асноўным не нацмены,
Гэта даўно ў нас выйшла з моды.
Мы з роднае сышлі арэны,
Зракліся мовы і народа.

Мы не чытаем роднай „Нівы”,
Бо на чужым мы возе едзем.
З нас кожны сапраўды шчаслівы,
Што не кранаюць нас суседзі.

Кажуць заўжды: народа сіла
У інтэлігенцыі ягонай.
Таму й народ наш такі хілы –
Ён без падтрымкі, абароны.

Святкуем сёння мы паўвека
Як быццам беларускай школы,
Нацыянальныя калекі.
Далейшы лёс наш невясёлы.

*16 мая 1994 года*

## Бяжыць сабака за машынай

Бяжыць сабака за машынай,
Астаткам сіл ужо бяжыць.
Машына дык імчыць няспынна,
І не дагнаць, і не ўкусіць.

Сабачы розум, што такое
Не можа зразумець ніяк.
Ці гэта мёртвае, жывое,
Што уцякае хутка так?

І тут рашэнне: гнацца досыць,
Загадкі той не адгадаць.
Сабаку толькі асталося
Сесці і сумна забрахаць.

## Песня інструктараў БГКТ

Працавалі, працавалі
Многа год.
Гуртавапі, гуртавалі
Наш народ.

Часам нас пачаставалі
Землякі,
Па дарозе пагублялі
Мы гурткі.

І дагэтуль гуртkoў многа
Не відаць.
Надта цяжка нам нябогам
Працаваць.

А ГП пераканаць чым
Сапраўды?
Як сабралі мала складчын
Праз гады.

Так прайшло нечспадзявана
Многа год,
Надалей незгуртаваны
Наш народ.

# Юбілейныя віншаванні і апошнія развітанні

## Басі Пякарскай

*У Саракагоддзе*

Бася мілая, як лекар,
Ты прафесійна і ўмела,
Прыпісваючы людзям лекі,
Лечыш хворыя іх целы.

Ды аднак у нашай глушы,
У айчынным нам Падляшшы,
Хворыя Ты лечыш душы
Тых усіх тутэйшых нашых.

Хочаш Ты вярнуць ім памяць
Аб айчынным іх народзе,
Каб усведамілі самі:
Хто яны, адкуль паходзяць?

Поспехаў Табе ў змаганні
І чарговых юбілеяў.
Здароўя, шчасця і прызнання,
Веры, Любові і Надзеі.

*24 студзеня 2007 года*

## Усе мы Твой вялікі клас

*Аліне Ваўранюк*
*у 45 гадоў з дня нараджэння*

Ты Юбіларка сёння ў нас.
Прымі ад сэрца віншаванні!
Усе мы Твой вялікі клас,
Цябе шануем мы дазвання.

А колькі ж у Табе надзей
У навучанні паспяховым!
Ад непісьменнасці дзяцей
Ратуеш Ты у роднай мове.

Дзеткі развучваюць з Табой
Многа сцэнічных розных твораў,
Так ачароўваюць ігрой
Як прафесійныя акцёры.

Трэба сказаць: экскурсавод
Надзвычай добры Ты таксама.
Праводзіш выезды штогод
У Беларусь – дзяцей з бацькамі.

І беларускі наш фальклор,
Частку знікаючых абрадаў,
Каб канчаткова не памёр,
Яго кіруеш на эстрады.

Магутны надта голас Твой,
Ён песні нашы ўзбагачае,
А разам ад душы з Табой
Моладзь, дарослыя спяваюць.

Жыві, Аліна, сто гадоў
Вучы, пішы, спявай заўсёды!
Да роднага ўздымай любоў!
Працуй далей ў карысць народу!

*29 лістапада 2009 года*

## Міраславе Лукшы

Ты, Міра, добрым чалавекам,
З чуллівым сэрцам і душой,
Вандруеш па зямлі паўвека,
Другая частка прад табой.

Кахаеш шчыра ўсё жывое,
Людзей, звяроў, птушыны свет,
З родным Падляшшам Тваe мроі
І Твой жыццёвы запавет.

Ты расслаўляеш родным словам,
Шчырай паэзіі радком,
Наш беларускі люд вясковы,
Знаёміш свет з яго жыццём.

Штодзень напорыста, цярпліва,
Ужо праз многія гады
Змагаешся на роднай ніве
І цешаць вынікі, плады.

Дык будзь шчаслівай, будзь здаровай,
Май заўжды паэтычны ўздым!
Табе ў другой жыцця палове
Жадаю поспехаў ва ўсім!

*9 лістапада 2008 года*

## Алесю Барскаму

Дарагі Алесь, мой Дружа,
Мы жывём яшчэ з надзеяй.
Падсумоўваннем нас служаць
Усе нашы Юбілеі.

Ды няма ўжо паваротy
Да таго, што раней мелі.
Прамінаюць нашы ўзлёты,
Будні творчыя, нядзелі.

Скалясілі мы з Табою
Беласточчыну-Айчыну.
Слова роднае, жывое
Мы тут сеялі няспынна.

Бралі мы цяжар на плечы,
Грамадзянскі абавязак.
Правялі ўдваіх сустрэчаў
Больш, як „белавежцы” разам.

Мы тут у сваім народзе
Чуліся як быццам дома.
Бо адгэтуль мы паходзім,
Кожны закутак вядомы.

Табе сёння пажадаю
Добрага здароўя многа.
Хай жыццё Цябе натхняе,
Да далейшай перамогі!

*2 лістапада 2005 года*

## Дзмітрыю Шатыловічу

Дарагі мой Дружа, Дзіма,
Я з Табой наяве, ў снах
Маю заўжды прад вачыма
Пройдзены супольна шлях.

Я у мірным сорак пятым
Пазнаёміўся з Табой.
Мы вучыліся заўзята
Ў бельскай школе дарагой.

Разбрыліся зноў па свеце
У пасляваенны час.
Заўжды з думкай аб асвеце,
Акрыляў нас і Пегас.

Лёс адзінкі – невядомы,
Пасля некалькіх гадоў
У Варшаве, ў адным доме
Мы сустрэліся ізноў.

Ты, аднак, як энергетык,
Працаваў шмат за мяжой.
І як гід звычайна гэтак
Вандраваў ты з грамадой.

І заўсёды з падарожжаў,
З краін і мацерыкоў,
Добрых вершаў шмат прывозіў,
Каб узбагаціць землякоў.

Калі стаў пенсіянерам –
Жывеш творчасцю найперш,
У Пегас не страціў веры,
Пішаш і шліфуеш верш.

У Васьмідзесяцігоддзе
Пажадаю ад душы:
Жыві доўга, ну і штодзень
Вершы надалей пішы.

*8 верасня 2006 года*

## Міхасю Хмялеўскаму

Час крадзе нам дзень за днямі,
Дажываем круглых дат.
І ўжо, Міхасёк, за намі
Роўнае Восемдзесят.

Наступае жыцця восень
Міма нашых засцярог,
Колькі яшчэ засталося
Знае толькі адзін Бог.

А жыць хочацца усё-ткі,
Дзе народ наш, родны кут.
Век людскі такі кароткі,
Госці мы на свеце тут.

І нягледзячы на гэта,
Што цяжэй жыць з кожным днём,
Чуем непрыхільнасць свету,
Хочам цешыцца жыццём.

Жыць без боляў і без сваркі,
Заўжды дружнаю сям’ёй,
Выпіць часам яшчэ чарку
У кампаніі сваёй.

І таму, мой мілы Братка,
Будзь вясёлы і здароў,
Каб яшчэ хоць дзве дзесяткі
На зямлі пражыць гадкоў!

*26 чэрвеня 2005 года*

## Уладзіміру Юзвюку

Дарагі Валодзя,
Сябра мой шчырэйшы!
Васьмідзесяцігоддзе
Тваё адзначыў вершам.

Хоць Ты не быў паэтам –
Мы йшлі ў адным напрамку.
Складаную па мне Ты
Цягнуць падняўся лямку.

Цяжар вялікі штодзень
Прымаў на свае плечы.
Мне заўжды пры нагодзе
Наладжваў Ты сустрэчы.

З Табой мы аднагодкі
І пакрысе старэем
І ў нашыя ўгодкі
Душою мы хварэем,

Што на вачах няспынна
Так незвычайна скора
Родны народ нявінны
У польскім тоне моры.

Зычу Табе, Валодзя,
Шчасця, здароўя, сілы,
Каб да Твайго Стагоддзя
Таго ўсяго хапіла.

*6 жніўня 2005 года.*

## Сейбіты

*Уладзіміру Наумюку*

Назваў ты мяне сейбітам
У час круглых жыцця гадавін.
Ты ўручыў мне разьбу: Сее жыта
З сявенькі стары селянін.

Да спадобы сімволіка гэта,
Мы з сялянскіх выводзімся хат.
Засяваем свой родны палетак
Сваім талентам год пяцьдзесят.

І стаіць у стэлажы над ложкам
Выраб сэрца Твайго, здольных рук,
І з сейбітам мне хочацца трошкі
Размаўляць, быццам ён мой сябрук.

Ён, як мы ўжо таксама сівенькі,
Яго змучыла праца, гады.
Так як ён са сваёй мы сявенькі
На палетках пакінем сляды.

*18 сакавіка 2005 года*

## Пятру Гагану
## ў яго творчы Бенефіс

Сто гадоў – век поўны чалавека,
Да яго імкніся, Дружа мой.
Пяцьдзесят – вядома што паўвека,
Гэта Ты ўжо маеш за сабой.

І Табе ў другой жыцця палове
Хочацца мне шчыра пажадаць
Многа шчасця, добрага здароўя
І каштоўнасці мастацкія ствараць.

Табе многа творчага натхнення,
Уражлівасці на прыродны свет,
Як найболей творчага гарэння,
Мастак таксама ж у душы паэт.

Падвойнае мы адзначаем Свята,
Сёння ж і Твой мастацкі Бенефіс.
Прадставіў Ты нам, Дружа, плён багаты,
Які паддаў пад творчы аналіз.

А на сцяне, што над кватэрным ложкам,
Сваёю сінявокаю красой
Мяне натхняюць сімвалы-валошкі,
Тваёю ж уваскрэшаны рукой.

*16 лістапада 2002 года*

***

**Л**аскавы лёс нас сутыкнуў з сабою,
**А**стапе, незабыўны Дружа мой.
**П**райшло гадоў нямала ў непакоях,
**С**астарыліся мы, на жаль, з табой.
**К**раіны роднай і свайго народу
**А**днак жа не забыць ніколі нам.
**М**ы вернымі ім сталіся заўсёды,
**У** сэрцы нам яны як Божы Храм.

## Памяці Зінаіды Навіцкай

Такія сумныя хвіліны,
Так многа ў нашых сэрцах болю.
Жывым заўчасна згаслай Зіны
Не ўбачыць больш у роднай школе.

Сёння аплаквае ўся моладзь
Дырэктарку свайго ліцэя.
Прырода расцвіце наўкола,
Мёртвых вярнуць – няма надзеі.

І толькі памяць астанецца,
Што зроблена так вельмі многа,
Каб нашы дарагія дзеці
Уласнаю пайшлі дарогай.

У развітальныя хвіліны
З жыццём абрабаваным смерцю,
Верым у гэтае, што Зіна
Жыць будзе заўжды ў нашых сэрцах.

*12 сакавіка 2004 года*

## Памяці Ады Чачугі

Колькі ж мы, Дарагая Ада,
Гадоў, што адплылі імкліва,
Надзвычай плённа, без аглядак,
На роднай працавалі ніве!

Мінула маладосць і сталасць –
Век плённы кожнае асобы,
І надыходзіла ўжо старасць,
З ёю смяротныя хваробы.

Усе адыдзем мы са свету,
Жыццё кароткае людское.
Толькі не ведаем аб гэтым,
Калі хто пойдзе за Табою.

Твая сямейка жыве ў смутку,
І многа блізкіх і знаёмых.
А Ты сном вечным спіш ціхутка,
Як гэта кажуць – Ты ўжо дома.

Спі, спі спакойна на Падляшшы,
Пасля з усімі развітання.
Жыць будзеш заўжды ў сэрцах нашых
І ў сваіх творчых разважаннях.

*30 жніўня 2008 года*

## Памяці Кастуся Майсені

Жыццёвы лёс зусім не быў салодкі,
Ён быў цярністы, Дарагі Кастусь.
Супроць Цябе было шмат розных сродкаў,
Ты ўсё жыццё цярпеў за Беларусь.

Цяжкім было і доўгае ўміранне,
Выгляд шпітальных хоспісных умоў.
Апошняе з Табою развітанне
Чуллівай Жонкі і Тваіх сяброў.

Ты ўсё жыццё сваё пражыў з надзеяй,
Што праца не растраціцца Твая.
Дык помнік Твой, у постаці музея,
Павінен быць Твайго, Кастусь, імя.

Спі, спі спакойна змагар за айчыну,
Пасля трывог жыццёвых і трудоў.
Хоць назаўсёды Ты ўсіх нас пакінуў –
Жыць будзеш заўжды ў сэрцах землякоў.

*Гайнаўка, 14 кастрычніка 2006 года*

## Памяці Прафесара Васіля Белаказовіча

Дружа мой, так нечакана
Пакінуў Ты знямоглы свет.
Астаўся я з балючай ранай
Табою ўслаўлены паэт.

Якую безліч слоў сардэчных
Ты перадаў маёй душы!
Сказаў: „Паэты жывуць вечна,
І не смуткуй, пішы, пішы”.

Ты праз жыццё праходзіў цяжка,
Вучыўся, навучаў, тварыў.
Працалюбівы, як мурашка,
І дабрачынны, аж на здзіў!

Славіў Ты родную краіну,
Нашых заслужаных людзей.
Нашчадкам Ты сваім пакінуў
Шмат кніг крытычных і ідэй.

Заўсёды адыходзіць хтосьці,
Толькі часова тут жывём.
Усе чаргова на пагосце
Спачнем апошнім вечным сном.

Спі, спі спакойна, Дружа мілы,
Без болю, без зямных трывог.
Хай сцеражэ Цябе магіла,
Няхай у апецы мае Бог!

*1 сакавіка 2010 года*

## Памяці Янкі Крупы

Пратанцаваў я надта многа
У жыцці гадочкаў.
Адтанцаваў свае я ногі
І іх падпёр кіёчкам.

Аб танцах не забыў ніколі,
Сніліся быццам святасць.
Жыў я ў самоце, з сумам, болем,
Хварэў, уміраў на раты.

І каб памерці – прасіў Бога,
Доні сказаў каханай:
„Пайду ў апошнюю дарогу
Ў кашулі вышыванай.

Сустрэну я ў нябесным міры
Епархію Святую,
І Ёй, як на зямельцы, шчыра,
Лявоніху станцую”.

*12 студзеня 2010 года*

# Змест

Вяртанне ў небыццё .......................... 5
Кругаварот ....................................... 6

**Дарагая вёска Мора**
**— мая калыска і апора**

Мазалі ......................................... 9
Аргенціна ...................................... 10
Табе, татулька, дзякуй! .................... 11
Трэніроўка ..................................... 12
Пекла і рай ...................................... 13
Мала мама спала ........................... 14
Вера .............................................. 15
Конскі сум ...................................... 16
Мой лес .......................................... 17
Грозная трахома ............................ 18
Дзіцячыя гульні ............................... 19
Віця і Міця ..................................... 20
Уралогія ......................................... 21
Аўтамабільнае крушэнне ................. 22
Выпадак ......................................... 23
Памяці швагра Васіля ..................... 24
Напярэдадні 2007 года ................... 25
Памяці Сястры Ніны ........................ 26
Адплываем з Мора ......................... 27
У сваё 85-годдзе ............................ 28

## Роднае Падляшша — малая Айчына наша


Рэчаіснасць ........................................ 31
Дзіўны горад Беласток ....................... 32
Райская птушка ................................. 33
Арлянская сінагога ............................ 34
Галакост ........................................... 35
Арлянская дзесяцігодка ..................... 36
Ачалавечаныя дрэвы .......................... 37
З прадшколлем у раздоллі ................. 38
Сустрэча ........................................... 39
Наш мяккі знак ................................. 40
Наша дзесяцігоддзе .......................... 41
Беластоцкі „Манхатан”....................... 42
У паўстагоддзе БГКТ ......................... 43
Я шчаслівы – паўвека з „Нівай” .......... 45
Наш Юбілей ...................................... 46
Наша паэзія ...................................... 47
Незвычайны будаўнік ........................ 48
Старасці плады ................................. 49
Басовішча ........................................ 50
Хору „Арляне” .................................... 51
Бандароўская гасцёўня ...................... 52


## Ад сэрца да сэрца


Ад сэрца да сэрца .............................. 55
У сотую гадавіну ................................ 56
Памяці Канстанцыі Буйло ................. 57
Выгнаннік ......................................... 58
Вечны агонь ...................................... 59
Каты – як людзі ................................. 60

Таленавітаму палешуку ...................... 61
Метамарфоза .................................... 62
Чаму Беларусь рускамоўная? ............. 63
Лятучы ліцэй .................................... 64
Наш Новы Запавет ............................ 65
Дваццаць Пятага Сакавіка .................. 66

**Заўсёды добрыя жанчыны жывуць у сэрцы, ва ўспамінах**

Калядны санет ................................... 69
Анёл і дэман ...................................... 70
Незабудкі ......................................... 71
Збылася мара .................................... 72
Наце гадоў дваццаць ......................... 73
Тры пакаленні .................................... 74
Як добра, што ты ёсць ........................ 75
*** (Душа мая кроўная…) ................... 76
Сяброўства ....................................... 77
Нашы жанчыны ................................. 78

**Нарадзіўся, памёр, уваскрос, каб паправіць чалавецтва лёс**

Раджджаство Хрыстова ........................ 81
Спявайма калядкі .............................. 82
Калядны сон ...................................... 83
У калядную ноч .................................. 84
Хрыстос Уваскрос! ............................. 85
Ушэсце ............................................. 86
Падзяка і просьба ............................. 87
Новыя алтары ................................... 88
Праваслаўныя могілкі ........................ 89
Смаленск .......................................... 90

**Ідуць гады, бягуць гады
і заціраюцца сляды**

Разважанні ........................................ 93
Роздум ............................................ 94
Этапы прамінання .............................. 95
*** (Сумны лёс мой…) ........................ 96
Наш лёс ........................................... 97
*** (Мы шагаем па родным краю…)..... 98
*** (Ідуць гады, бягуць гады…) ........... 99
Наша жыццё ..................................... 100
Ільняны алей .................................... 101
Ляўша ............................................. 102
Нікіфар ............................................ 103
Два моры ......................................... 104
Васількі ............................................ 105
Я не асенні, а вясенні ......................... 106

**Уваскрасае нам прырода,
а мы старэем з кожным годам**

На Гданьскім узбярэжжы .................... 109
Чалавек і прырода ............................. 110
Ільняны блакіт ................................... 111
Палявая груша ................................... 112
Ліпа ................................................. 113
Ноч над морам ................................... 115
Салаўіныя ночы ................................. 116
Зязюля ............................................. 117
Камары ............................................ 118
Аўгустаў ........................................... 119
Каламбуры ........................................ 120

## Аб жыцці шчыра ў святле гумару і сатыры


Вяселле з пахмеллем ........................ 123
Carpe diem! ....................................... 124
Чаму ты так доўга жывеш? .................. 125
Забіць час ......................................... 126
Ці можна і ці варта? ............................ 127
Чыноўніцкае крэсла .......................... 128
На Цэнтральным у Варшаве ............... 129
Мы без народа, роднай мовы ............. 131
Бяжыць сабака за машынай ................ 133
Песня інструктараў БГКТ .................... 134


## Юбілейныя віншаванні І апошнія развітанні


Басі Пякарскай .................................. 137
Усе мы Твой вялікі клас ....................... 138
Міраславе Лукшы ............................... 140
Алесю Барскаму ................................ 141
Дзмітрыю Шатыловічу ........................ 142
Міхасю Хмялеўскаму .......................... 144
Уладзіміру Юзвюку ............................ 145
Сейбіты ........................................... 146
Пятру Гагану ў яго творчы Бенефіс ..... 147
*** (Ласкавы лёс...) ............................ 148
Памяці Зінаіды Навіцкай .................... 149
Памяці Ады Чачугі .............................. 150
Памяці Кастуся Майсені ..................... 151
Памяці Прафесара
Васіля Белаказовіча ........................ 152
Памяці Янкі Крупы ............................. 154

Праграмная рада тыднёвіка „Ніва
Беласток 2010

**Redaktor**
Witalis Łuba

**Opracowanie graficzne i skład komputerowy**
Adam Pawłowski

Na pierwszej stronie okładki zdjęcie **Waldemara Kwiatkowskiego**, na czwartej zdjęcie rodziny Szwedów z 1931 roku.

**© Copyright by Rada Programowa Tygodnika „Niwa” & Wiktor Szwed, 2010**

Zrealizowano przy wsparciu finansowym
**Urzędu Marszałkowskiego
Województwa Podlaskiego
w Białymstoku**

Podlaskie

**ISBN 978-83-925904-7-7**

**Druk**
Orthdruk, ul. Składowa 9, 15-399 Białystok